# ВЫСТАЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ КОМСАМОЛУ

17 кастрычніка ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна (Менск) адкрылася вялікая выстаўка, прысвечаная 20-годдзю ленінска-сталінскага комсамола. Прадстаўленыя на выстаўцы матэрыялы знаёмяць з зараджэннем комсамола, з яго гераічнай барацьбой на франтах грамадзянскай вайны, на соцыялістычнай будоўлі.

Выстаўка адлюстроўвае падпольную работу комсамола Беларусі ў часе белапольскай акупацыі. У фотаздымках паказаны комсамольскія газеты і лістоўкі, якія друкаваліся ў нелегальных друкарнях.

На выстаўцы многа матэрыялу аб першых годах існавання комсамола, аб арганізацыі комсамолам школ, аб удзеле комсамола ў першых суботніках.

Шматлікія фотаздымкі паказваюць выдатную работу комсамольцаў і комсамолак на прадпрыемствах соцыялістычнай радзімы, паказваюць комсамольцаў — лепшых людзей совецкай краіны, дэпутатаў Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

На выстаўцы прадстаўлены творы правадыроў народа Леніна і Сталіна аб комсамоле.